Министерством образования нам отведена курирующая роль в разработке учебных планов по проблемам экономического образования. Мы должны работать в тесном сотрудничестве со всеми вузами, так как сейчас подготовка экономических кадров осуществляется в 16 государственных и около 20 негосударственных вузах. Мы несем ответственность за уровень этой подготовки, потому что разрабатываем учебные планы, ведем определенную методологическую работу.

Особенно остро в настоящий момент стоит проблема подготовки учебников и учебных пособий, потому что, к сожалению, другие вузы меньше выпускают литературы по экономике. Некоторая литература готовится только в нашем университете, а финансирование печатной продукции сейчас очень ограничено. Поэтому я призываю другие экономические вузы, а также Министерство экономики подключиться и создать какой-то консультативный орган (совет) по проблемам экономического образования с целью координации и определения основных направлений нашей деятельности. Это важно, потому что без хороших учебников очень сложно учить, как, впрочем, и без хороших преподавателей.

Есть у нас сложности в формировании кадрового потенциала, хотя последнее время ситуация улучшилась. Мы уже успешно комплектуем аспирантуру. Нам удается решать вопросы стажировки, в том числе зарубежной. В 1995 г. 47 наших преподавателей побывали за рубежом на конференциях и стажировке. При недостаточном количестве валюты вопросы стажировки приходится решать благодаря личным контактам, помощи различных фондов, сотрудничеству.

В этом плане важно отметить расширяющиеся международные связи. Наши преподаватели активно сотрудничают с зарубежными вузами. В процессе общения мы убеждаемся, что к нам возникает определенная степень доверия, желание сотрудничать. Мы широко сотрудничаем с вузами Германии, Франции, утвержден проект по программе ТАСИС с Барселонским университетом.

**Г.М. ЛЫЧ**, *акадэмік*

*(Інстытут эканомікі Акадэміі Навук Рэспублікі Беларусь)*

## ЗАДАЧЫ ЭКАНАМІЧНАЙ НАВУКІ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

Як вядома, навука з'яўляецца часткай цэлага. Цэлае — гэта грамадства. Якое грамадства, такая і навука. Гэта, па-першае. Па-другое, эканамічная навука з'яўляецца часткай навукі цалкам. Яна дастасуецца да той падсістэмы грамадства, якая з'яўляецца эканомікай. Значыць, якая эканоміка, такая і эканамічная навука.

А зараз давайце нагадаем, якой была эканоміка Беларусі ў недалёкім мінулым, і паспрабуем асэнсаваць, чым яна з'яўляецца сёння.

Усе мы ведаем, што эканоміка Беларусі ў савецкі перыяд не была нацыянальнай у поўным сэнсе гэтага слова. Яна з'яўлялася толькі арганічнай часткай адзінага народнагаспадарчага комплексу, але не валодала важлівасцямі самастойнага развіцця і была падпарадкавана перш за ўсё рэалізацыі агульнасаюзных дзяржаўных інтарэсаў. Безумоўна, адсюль не вынікае, што наша эканоміка ўвогуле не садзейнічала рэалізацыі нацыянальных інтарэсаў Беларусі. Бо факт застаецца фактам: за гады савецкай улады матэрыяльны дабрабыт і культурны ўзровень жыцця беларускага народа значна павысіліся, а гэта якраз і з'яўляецца бясспрэчным сведчаннем таго, што эканоміка Беларусі ў савецкі перыяд развівалася не толькі ў дзяржаўных інтарэсах СССР, але і ў нацыянальных запатрабаваннях нашай рэспублікі. Аднак наўрад хто стане аспрэч-

ваць наяўнасць істотных супярэчнасцяў паміж нацыянальнымі інтарэсамі асобнай саюзнай рэспублікі і дзяржаўнымі інтарэсамі Савецкага Саюза цалкам. Калі да канца быць шчырым, то давядзецца пагадзіцца з тым, што менавіта яны ў рэшце рэшт і прывялі да распаду СССР. Інакш немагчыма растлумачыць, чаму так хутка адбываўся гэты развал, а зараз так марудна з аглядкай адлюстроўваецца інтэграцыйны працэс у рамках Садружнасці Незалежных Дзяржаў; чаму так настойліва, нягледзячы на неймаверныя ўмовы ў пераважнай большасці незалежных дзяржаў праводзіцца курс на забеспячэнне свайго эканамічнага суверэнітэту.

Калі з адзначаных пазіцый падыйсці да ацэнкі мінулага і сучаснага становішча эканамічнай навукі Беларусі, то мы абавязкова прыйдзем да сумнага вываду. Ён заключаецца ў тым, што ў савецкі перыяд у нас не было і, на жаль, па сённяшні дзень не існуе нацыянальнай беларускай эканамічнай навукі.

Можна гаварыць, аднак даволі ўмоўна, хіба толькі аб некаторых парастках такой навукі, прычым вельмі кволых. Мабыць, не ўсе пагадзяцца з апошняй маёй думкай. Не выключаю нават, што знойдуцца і такія, хто паспрабуе мяне назваць нацыяналістам, зыходзячы з таго пункту погляду, згодна з якім увогуле не павінна быць якойсці нацыянальнай беларускай навукі, паколькі існуе адзіная сусветная эканамічная навука. Таму лічу неабходным спыніцца падрабязней на гэтым.

Найперш паясню сваю пазіцыю па пытаннях нацыі, нацыянальнага і нацыялістычнага, якія па сённяшні дзень па-рознаму ўспрымаюцца навукоўцамі. Асабіста я прытрымліваюся такога пункту погляду, дзе нацыя — гэта гістарычная супольнасць людзей, звязаная мовай, культурай і складам розуму, якія выкарыстоўваюць узаемныя эканамічныя сувязі, сумесную тэрыторыю, нацыянальную дзяржаву як сродак нацыянальнага выжывання і развіцця, а не ў якім разе ні этнічныя ці біялагічныя адзінства, якія грунтуюцца на агульнасці паходжанняў, ці, як кажуць, па крыві, па родаплемянных інстынктах, і часта выкарыстоўваюцца ў эгаістычных мэтах. Таму, калі зыходзіць з такіх падстаў, дык няма ніякага сэнсу ставіць знак роўнасці паміж нацыянальным і нацыялістычным.

У адрозненне ад нацыяналізму, асноўны змест якога зводзіцца да выдзялення з усіх нацый адной у якасці прывілеяванай, а то і пануючай, нацыянальны падыход грунтуецца на жывым, раўнапраўным узаемадзеянні нацый, ён аднолькава спрыяльны для ўсіх. Толькі пры ўзаемадзеянні нацый практычна магчыма паслядоўнае развіццё найважнейшых каштоўнасцяў кожнай асобнай нацыі, як нацыянальная мова, культура, псіхалогія, традыцыі и г.д.

Зыходзячы з такіх пазіцый па нацыянальнаму пытанню, на маю думку, ёсць усе падставы гаварыць аб неабходнасці існавання нацыянальнай эканамічнай навукі. Інтарэсы розных нацый не толькі ў многім супадаюць, але і значна разыходзяцца. Больш таго, нават супярэчаць адны другім. У такіх умовах здаровае эканамічнае мысленне не можа не быць пераважна нацыянальным. І сапраўды, любая эканамічная тэорыя, што нараджалася ў той ці іншай краіне, нават самая абстрактная, мела глыбокія нацыянальныя карані, была накіравана на тое, каб знайсці прычыны беднасці перш за ўсё сваёй нацыі і яе найбольш кароткія эфектыўныя жыццёвыя шляхі да багацця. Асабліва відавочным гэта рабілася, калі тэорыі дапаўняліся практычнымі вывадамі і рэкамендацыямі.

Вартай падставай існавання нацыянальнай эканамічнай навукі з'яўляецца ўласцівы кожнай нацыі своеасаблівы сацыяльна-эканамічны генатып, які ў рашаючай меры прадвызначае ўсю сістэму рыначных і нерыначных інстытутаў, прызначаных для шматузроўневага рэгулявання эканамічнай дзейнасці грамадства. Акрамя таго, усім нам добра вядома, што, з аднаго боку, эканамічнае развіццё розных краін свету адбываецца

нераўнамерна, а з другога — механізм гаспадарання знаходзіцца ў цеснай залежнасці ад дасягнутага ўзроўню. Адсюль таксама вынікае, што кожная краіна павінна мець сваю нацыянальную эканамічную навуку, якая б дапамагала ёй з улікам асаблівасцяў мясцовых умоў больш паспяхова рэалізоўваць яе нацыянальна-дзяржаўныя інтарэсы.

І апошняе. Я не ў якім разе не хацеў бы абмовіць правільнасць існавання сусветнай эканамічнай навукі. Паколькі, як ужо было зазначана раней, інтарэсы нацый не толькі адрозніваюцца, але і ў многім супадаюць, то ў эканамічным развіцці розных краін, нацый маецца шмат агульнага. А калі так, то не можа не існаваць і агульнасусветнай эканамічнай навукі. Аднак паўтараю, яе існаванне ніякім чынам не выключае існавання нацыянальных эканамічных навук, галоўнае прызначэнне якіх — дапамагаць кожнай асобнай нацыі ва ўзаемадзеянні з усімі астатнімі нацыямі дамагацца як мага больш поўнай і паслядоўнай рэалізацыі менавіта сваіх уласных эканамічных, сацыяльных, палітычных і іншых інтарэсаў.

З улікам усяго сказанага, можна прыйсці да высновы, што для ўсіх нас, што працуюць на ніве беларускай эканамічнай навукі і беларускай эканамічнай адукацыі, сёння няма больш важнай задачы, чым выпрацоўка сапраўды нацыянальнага эканамічнага мыслення і забеспячэння валодання ім самымі шырокімі коламі нашых грамадзян. Перш за ўсё, безумоўна, нашымі дзяржаўнымі палітычнымі дзеячамі, а таксама гаспадарчымі кіраўнікамі, якія сваімі практычнымі дзеяннямі ў рашаючай меры прадвызначаюць эканамічнае і сацыяльнае развіццё нашай Беларусі.

Адразу зазначу, што задача гэта далёка нялёгкая. Асабліва калі ўлічыць, што на працягу многіх дзесяцігоддзяў нас з упартай настойлівасцю адвучвалі думаць пра нацыянальныя інтарэсы. І трэба сказаць — не без поспехаў. Інакш, чым можна растлумачыць той факт, што пазбавіўшыся ў рэшце рэшт ад неабходнасці зыходзіць у сваіх думках і практычных дзеяннях з інтарэсаў узроўню саюза дзяржавы, многія з нас лёгка паддаліся шкоднаму ўплыву заходніх эканамістаў-палітыкаў і пачалі мысліць часам у інтарэсах іхніх краін. Дарэчы, гэта з'яўляецца адной з асноўных прычын таго, што мы так доўга не можам саўладаць з крызісам і ўсё больш і больш падрываем эканамічныя асновы нашай дзяржаўнай незалежнасці, а разам з ёй — і светлыя надзеі на лепшую будучыню.

Не менш сур'ёзнай перашкодай на шляху паспяховага вырашэння адзначаных задач з'яўляецца абмежаванасць кадравага патэнцыялу эканамічнай навукі Беларусі і яго нездавальняючы склад. Апошняе ў значнай меры тлумачыцца перажыткамі нядаўняга мінулага, якое не бачыла асабістай патрэбы ва ўсебаковым развіцці ў Беларусі эканамічнай навукі. З пункту погляду агульнасаюзнай дзяржавы ў гэтым не было ніякай неабходнасці. Эканамічная навука, што развівалася ў саюзных рэспубліках (у тым ліку і ў Беларусі) прызначалася для вырашэння ў асноўным асобных задач, пераважна рэгіянальнага аспекту. Таму наша беларуская эканамічная навука ў савецкі перыяд была фрагментарнай. Гэта я магу падцвердзіць той акалічнасцю, што ў нас, у Беларусі, практычна не праводзіліся даследаванні, звязаныя з вывучэннем сусветнай эканомікі ці міждзяржаўных эканамічных адносін, і па сённяшні дзень у гэтым накірунку мы таксама па сутнасці маем прабел.

На вялікі жаль, становішча ніколькі не палепшылася пасля таго, як Беларусь стала незалежнай дзяржавай. Наадварот, яно нават пагоршылася, аб чым яскрава сведчыць істотнае змяншэнне за апошнія гады колькасці беларускіх навукоўцаў, якія займаюцца правядзеннем даследаванняў.

Я не буду прыводзіць канкрэтныя лічбы, распавядаць пра прычыны. Скажу толькі, што ў выніку павальнага скарачэння навуковых кадраў, інстытут эканомікі Акадэміі навук Беларусі практычна страціў здольнасць да самастойнага ажыццяўлення комплексных фундаментальных

даследаванняў, але думаю, што да гэтага прыблізіўся і другі вядучы цэнтр эканамічнай навукі — Навукова-даследчы эканамічны інстытут Міністэрства эканомікі. Таму, на маю думку, без неадкладнага пераадольвання такой адмоўнай тэндэнцыі ў адносінах да кадравага патэнцыялу беларускай эканамічнай навукі не можа быць сур'ёзнай размовы аб якім-небудзь больш ці менш паспяховым навуковым забеспячэнні нашага сацыяльна-эканамічнага развіцця. Гэта дае падставы сцвярджаць, што рэзкае павышэнне колькасці і якаснага стану навуковых супрацоўнікаў, занятых правядзеннем эканамічных даследаванняў, забеспячэнне рэнтабельнай эканамічнай навукі як цэласнай, а не фрагментарнай — сёння наша галоўная задача. І пажаданы поспех прыйдзе толькі пры ўмове наладжвання самага цеснага супрацоўніцтва эканамічнай навукі з вышэйшай эканамічнай школай, пры належнай падтрымцы гэтага працэсу з боку дзяржавы. Бо зараз рэальных магчымасцяў у вышэйшых навучальных і вышэйшых навукова-даследчых установах далёка недастаткова, каб яны маглі самі, без дапамогі дзяржавы, справіцца з дадзенай праблемай.

Выкладзеныя задачы па сваёй сутнасці з'яўляюцца зыходнымі, стратэгічнымі. Іх паслядоўнае практычнае вырашэнне павінна ў рэшце рэшт прывесці да фарміравання ў нас сапраўды нацыянальнай эканамічнай навукі і стварэння неабходных перадумоў для паспяховага рашэння ўсіх астатніх задач, што стаяць перад вучонымі-эканамістамі. Аднак адсюль зусім не вынікае, што пакуль мы не справімся са стратэгічнымі задачамі, мы не павінны прыступаць да іншых, пераважна тактычнага плану. Такая жорсткая паслядоўнасць у практычным вырашэнні задач для эканамічнай навукі безумоўна непрымальная. Мы проста абавязаны ў меру сваіх сіл і магчымасцяў паралельна рашаць многія задачы, тым больш тыя з іх, якія не могуць цярпець ніякага адкладу.

Распрацаваць навукова абгрунтаваную перспектыўную мадэль нацыянальнай эканомікі Рэспублікі Беларусь і механізм яе эфектыўнага функцыянавання практычна немагчыма без распрацоўкі адпаведнай мадэлі ўсяго нашага грамадства. Гэта значыць, што павінна быць цесная ўвязка з перспектыўнай мадэллю палітычнай, сацыяльнай, культурнай і іншымі падсістэмамі. Але можа немагчыма на практыцы арганізаваць і, галоўнае, здзейсніць такія шырокамаштабныя комплексныя навуковыя даследаванні? Так, пакуль што немагчыма. Асабліва — ў галіне фундаментальных, прыкладных даследаванняў. Па-першае, зрабіць гэта нам не дазволіць прыняты парадак размеркавання фінансавых сродкаў, якія выдзяляюцца для правядзення фундаментальных даследаванняў, — размеркаванне па міністэрствах і іх падведамасных установах. Па-другое, калі грошы ўжо размеркаваны, дык кожны выкарыстоўвае іх так, як ён лічыць найбольш неабходным. І тут ужо ніякай каардынацыі, арганізацыі правесці немагчыма.

Непераадольнай перашкодай на шляху правядзення комплексных прыкладных даследаванняў, накіраваных на вырашэнне агульных нацыянальных праблем, з'яўляецца адсутнасць дзяржаўнага заказчыка. Камітэт па навуцы і тэхналогіях чамусці не палічыў патрэбным узяць на сябе функцыі дзяржаўнага заказчыка па такіх комплексных распрацоўках, не прадугледзеў надзяленне імі Савета Міністраў ці Адміністрацыі Прэзідэнта. Спецыялізаваныя галіновыя, функцыянальныя міністэрствы і ведамствы практычна не могуць узяць і, як правіла, не бяруць на сябе функцыі дзяржаўнага заказчыка па рэспубліканскіх навукова-тэхнічных праграмах і асобных праектах, калі кіраванне апошнімі ўваходзіць у рамкі іх асноўнай дзейнасці. Такім чынам штучна ўтвараецца кола, з якога няма задавальняючага выйсця. Як звычайна паступаюць у такіх выпадках навукоўцы, дзяржаўныя органы кіравання навукова-тэхнічнай дзейнасцю? Вельмі проста. Вось толькі ці разумна — гэта ўжо іншае пытанне. Практычна адбываецца так:

комплексная тэма дзеліцца на спецыялізаваныя, навуковы комплексны калектыў дзеліцца на спецыялізаваныя групы і кожная пачынае працаваць паасобку. Вынік атрымліваецца нікчэмны. Таму сёння вельмі важнай задачай эканамічнай навукі, вышэйшай адукацыі і дзяржаўнага кіравання з'яўляецца распрацоўка механізму ўзаемадзеяння ўсіх тых, хто застаўся здольным працаваць у галіне эканамічнай навукі.

**Э.М. БАБЕНКО**, *доктор технических наук, профессор*
**Н.И. БОГДАН**, *кандидат экономических наук, доцент*
*(Полоцкий государственный университет)*

## РОЛЬ ЭКОНОМИЧЕСКОГО ОБРАЗОВАНИЯ В РАЗВИТИИ ЭКОНОМИЧЕСКОГО ПОТЕНЦИАЛА РЕГИОНА

Потенциал вообще (в виде экономических знаний, рационального экономического поведения, склонности к предпринимательству) следует рассматривать как предпосылку эффективного движения вперед экономики. В республике на региональном уровне складывается сложная ситуация. Призвав к проведению демократических реформ, внедрению рыночной экономики, государство пока еще не создало действенного механизма для их реализации. С одной стороны, властные структуры не осознали, что острейшие социально-экономический и политический кризисы, в которых находится общество, есть результат преобладания управления над самоуправлением. А с другой стороны, результаты референдума показали, что люди связывают свое положение с центром и очень часто надеются только на него. Регионы сейчас еще отстают в формировании современного экономического сознания. Вся активная экономическая жизнь, например, конференции, семинары, консультации международных экспертов в основном происходят в столице. Но для продвижения рыночных реформ необходимо сформировать современный экономический образовательный потенциал и на местах.

Для того, чтобы потенциал экономического образования соответствовал потребностям страны и отдельных регионов, необходимо: согласовывать масштабы и структурную подготовку кадров с реальными потребностями экономики в целом и отдельных регионов; ориентироваться на мировые стандарты в подготовке кадров; обеспечивать мобильность кадров с учетом формирования развитых систем повышения квалификации (часто должности экономистов сейчас занимают специалисты без экономического образования); формировать позитивное отношение к инновациям, умение принимать оптимальные управленческие решения на разных уровнях управления, воспитывать кадры, имеющие навыки действия в реальных экономических ситуациях и осознающие важность профессиональной этики.

В реализации указанных направлений мы сталкиваемся со многими трудностями. Это недостаточная финансовая поддержка со стороны государства сферы образования; дефицит ресурсов, в том числе финансовых; сложности в адаптации к западным методикам преподавания дисциплин рыночной экономики в наших вузах.

Следует отметить, что в процессе реформ в Беларуси не произошло сдвига от централизованной государственной системы управления в сторону развития местного самоуправления, и в регионах нет средств для расширения самостоятельности, отсутствуют экономические, правовые рычаги формирования социально-экономической деятельности в пределах своей территории. Определив направления высшего экономического образования, необходимо разработать механизм преодоления имеющихся проблем и на этой основе сформировать региональные центры экономического образования, создать условия для их развития.



Беларускі дзяржаўны эканамічны ўніверсітэт. Бібліятэка.
Белорусский государственный экономический университет. Библиотека.
Belarus State Economic University. Library.
http://www.bseu.by